Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2017-11-10

# ПРА СУСЕДЗЯЎ — ДЗЕЦЯМ

**У выдавецтве «Харвест» выйшлі кніжачкі «Украіна» (2016) і «Польшча» (2017), прысвечаныя гісторыі і сучаснаму жыццю, культуры, мове і прыродзе нашых дзяржаўсуседзяў. Выданні былі распрацаваныя пры падтрымцы Цэнтра славянскіх моў і культур пры ўдзеле дырэктара цэнтра Ірыны Зімневай і супрацоўніцы Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Паўліны Скурко. Аўтар ідэі і адказны рэдактар — Алеся Чарнавокая.**

Найбольш зацікавяць кнігі вучняў сярэдняй школы, але чытаць іх можна і ў сямейным коле. Кніжкі напісаны даступнай мовай (у адрозненне ад многіх падручнікаў), багата аздоблены ілюстрацыямі — фотаздымкамі, малюнкамі, рэпрадукцыямі твораў мастацтва. Паляк Лешак і ўкраінец Сланечнік, якія са старонкі на старонку водзяць чытачоў сцежкамі сваіх родных краін, распавядаюць пра прыродныя асаблівасці, жыхароў, нацыянальную кухню, мастацтва, вядомых дзеячаў і многае іншае. Тэксты суправаджаюцца жартамі, загадкамі, крыжаванкамі.

Лешак і Сланечнік звяртаюць увагу на тое, што, нягледзячы на зменлівасць дзяржаўных межаў і сцягоў на тэрыторыі сучасных Польшчы і Украіны ў далёкай (і не вельмі) мінуўшчыне, нашыя суседзі не згубілі ў гістарычных лабірынтах сваіх родных моў. І гэтаму беларусам варта ў іх павучыцца.

Мяркуецца, што выданні «Польшча» і «Украіна» стануць першымі раздзеламі дзіцячай энцыклапедыі «Беларусь між суседзямі». Сапраўды, у сучасным свеце, які поўніцца палітычнымі канфліктамі, пошук у гістарычнай спадчыне супольнага, а не адрознага падаецца надзвычай актуальным.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

Яўгенія Шыцька. Пра суседзяў - дзецям